# Змест


Дзень, калі пайшоў снег . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

Галубы на падаконні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 9

Сюрпрыз з галубятні . . . . . . . . . . . . . . . . . . 16

Прагулка над горадам . . . . . . . . . . . . . . . . . 26

Галубіная пошта . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37

Таямнічая незнаёмка . . . . . . . . . . . . . . . . . . 44

Фабрыка снегу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55

Як выробляюць снег . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 64

Аддзел незвычайных пагодных з’яў . . . . . . . . 74

Дамоў без лятучага парашку . . . . . . . . . . . . . 83

Вялікі галубіны сход . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 93

Сустрэча ў парку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106

Спрэчка на падаконні . . . . . . . . . . . . . . . . . 117

Куды ідзе ўвесь снег . . . . . . . . . . . . . . . . . 126

Бітва за востраў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 138

Навагодняя мара . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 153



# Дзень, калі пайшоў снег

Марта каторы дзень не ў настроі. Бо які настрой, калі за акном дождж і гразюка? У сакавіку такое надвор'е цярпець яшчэ можна, у лістападзе ад яго нікуды не падзенешся. Але на дварэ — сярэдзіна снежня, і з неба мусіць сыпаць прыгожы перадновагодні снег.

Усё выглядала так непрыемна, што дзяўчынка без канца жалілася маме на тое, чаго за акном быць не павінна.

— Лужыны ўзімку — гэта поўнае глупства, мама! Ты калі-небудзь чула, каб па лужынах каталіся на каньках ці хаця б на санках? Вось і я не чула.

Але лужынам не было справы да яе скаргаў. Яны паблісквалі на асфальце і мачылі боты і колы, калі тыя ў іх незнарок траплялі.

— І што гэта за голыя дрэвы? Глядзі: усе клёны, ясені і дубы паводзяцца няправільна! Вядома, ніхто

і не чакае, што яны будуць зялёныя ці жоўта-аранжавыя. Але чаму яны не захутваюцца ў снежныя шалікі?

Аднак разлапістыя клёны, ясені і дубы рабілі выгляд, што ім і так добра.

— А паглядзі на зямлю, мама! У снежні зямля выглядае зусім не так! Як з гэтай чорнай гадасці з агіднымі пучкамі сухой травы ляпіць снегавіка? І як гуляць у снежкі? Хіба што ляпіць гразевікá і гуляць у гразéшкі.

Марта ўявіла цёмна-карычневага монстра з гразюкі ў самым цэнтры двара. І дзяцей, якія весела перастрэльваюцца такімі ж цёмна-карычневымі камякамі і потым вяртаюцца дадому, перапэцканыя з галавы да ног.

— Няправільныя лужыны! Няправільныя дрэвы! Няправільная зямля! — злавалася Марта. — І ўвогуле ўся зіма — няправільная!

Настрой не паляпшала нават тое, што была нядзеля — любімы дзень Марты. Бо звычайна ў нядзелі (калі толькі не здаралася чагосьці звышнатуральнага, напрыклад міжгалактычнай вайны ці вывяржэння вулкана) яны з татам выпраўляюцца на прагулку. Нядзеля — адзіны дзень, калі тата не на працы. Праўда, апошнім часам ён бярэ працу нават дадому, і выцягнуць яго на прагулку атрымліваецца не заўсёды. У такім выпадку Марта ідзе гуляць з мамай. Але хто б дзяўчынку ні суправаджаў, прагулкі амаль заўсёды заканчваюцца ў краме. Гэта па-свойму нядрэнна: Марце падабаецца выбіраць з бацькамі прадукты, асабліва цукеркі ці марожанае. Хаця гуляць яна ўсё адно любіць больш.

Цяпер Марта сядзела ля акна і змрочна крэмзала на палях школьнага сшытка нешта падобнае ці то на магічныя сімвалы, ці то на сняжынкі. Рабіць хатняе заданне не хацелася, а за акном нічога цікавага не было. Калі, вядома, не лічыць двух галубоў, якія якраз у гэты момант шумна апусціліся на падаконне па іншы бок шыбы. Марта адарвала вочы ад крамзоляў і паглядзела на птушак. Галубы тапталіся па шэрай блясе і спрабавалі нешта дзяўбці. «Во дурныя, — падумала дзяўчынка. — Няўжо спадзяюцца знайсці што-небудзь ядомае?» Але хутка надакучылі і яны. Бо што з іх возьмеш? Галубы як галубы, шызыя і заўжды галодныя. Ды і прылятаюць сюды не першы раз.

Тут у дзверы яе пакоя пастукалі.

— Можна, даражэнькая? — гэта была мама.

— Можна, — буркнула Марта.

Дзверы прачыніліся, і ў шчыліне паказалася мамінa галава.

— Ну што, дачушка, збіраемся?

Значыць, сёння тата зноў узяў працу на дом.

— Угу, — не надта бадзёра адгукнулася Марта.

— Але адразу паедзем у краму.

— Добра, — пагадзілася дзяўчынка.

Крама дык крама, абыякава падумала яна. У такое надвор'е на вуліцы ўсё адно няма чаго рабіць.

У краме Марта адразу ж скіравалася ў кандытарскі аддзел, пакінуўшы маці сам-насам з крупамі і агароднінай. Дзяўчынка каталася ўздоўж паліц з цукеркамі, зефірам і мармеладам і прыгадвала, чаго дома не хапае. Захапіўшыся гэтым заняткам, яна ледзь

не наехала на сухарлявага, непрыемнага з выгляду дзядзьку. Той таксама прыглядаўся да ласункаў і таксама не бачыў нічога навокал, але ў апошні момант усё ж паспеў заўважыць, што на яго насоўваецца вазок.

— Ты што, не бачыш, што я тут іду?!! — зароў ён на Марту.

Дзяўчынка ад нечаканасці аж уздрыгнула, але хутка схамянулася і зараўла ў адказ:

— А вы што, не бачыце, што я тут еду?!!

Дзядзька крыху збянтэжыўся, аднак ягоная злосць тут жа вырасла ў сто тысяч разоў.

— Хто цябе сюды ўвогуле пусціў? — сказаў ён ужо цішэй, хоць было бачна, што з яго вушэй вось-вось паваліць пара. — Вазкам у крамах не месца! Перашкаджаеш тут хадзіць!

«Ён што, не разумее, што без колаў я не магу?» — здзіўлена падумала Марта.

І тут у яе галаве мільганула шкадлівая думка. Секунду дзяўчынка вагалася, але змагацца з такой цудоўнай думкай было немагчыма.

— Ну добра, тады я пакаціла, — з удаванай рахманасцю сказала яна і, разварочваючыся, наехала маленькім пярэднім колам дзядзьку на нагу. Літаральна на адно імгненне. А потым скурчыла спалоханую міну: — Ой!

Дзядзька ўскрыкнуў, адскочыў і прамармытаў нешта неразборлівае. Задаволеная Марта хуценька ад яго ад'ехала і прыкінулася, што разглядае шакаладкі, а сама краем вока сачыла, што будзе далей.

Дзядзька пагразіў ёй кулаком, але ягоная рашучасць некуды знікла. Ён паплёўся ў мясны аддзел і, абурана махаючы рукамі, пачаў расказваць нешта прадавачцы. Пра што была іхняя гаворка, Марта ўжо не чула.

Аднак добрага настрою хапіла ненадоўга. Варта было выехаць з крамы на вуліцу, як ён зноў дарэшты знік, бо навокал панавалі ўсё тыя ж шэрасць і слата. Хацелася як мага хутчэй вярнуцца ва ўтульны пакой, на паверх вышэй за лужыны і бруд. Так што Марта з мамай не марудзячы рушылі дадому. Зноў апынуўшыся ля свайго акна, дзяўчынка ўздыхнула. Гэтая зіма, а дакладней, яе адсутнасць, псуе ўсё, нават нядзелю. «Хачу, каб зараз жа пайшоў снег і ішоў так доўга, пакуль не засыпле ўвесь горад!» — сярдзіта і ад душы прашаптала Марта сабе пад нос.

Галіны куста пад акном загайдаліся, быццам падаючы ёй нейкі знак. Марта фыркнула і ўзялася за кнігу. Раптам — што б гэта магло быць? — за шклом пракружыла белая дробная мушка. Ад нечаканасці дзяўчынка не паспела яе як след разгледзець. Адклаўшы кнігу, яна ўтаропілася ў акно. І вось ужо новая мушка павольна выводзіць у паветры мудрагелістыя завіткі. Марта ахнула і не адрывала ад яе вачэй, пакуль тая не знікла за краем аконнай рамы. Але доўга чакаць наступную не давялося, і ўжо праз некалькі хвілін у паветры кружыў цэлы рой пухнатых белых мух. Дзяўчынка захоплена сачыла за іх палётам, а потым падсунулася да шыбы ўсутыч і зірнула ўніз.

Тыя сняжынкі, што падалі на лужыны і на мокры асфальт, тут жа раставалі, але на грудах апалага лісця і на пажухлай траве ўжо дзе-нідзе ляжалі белаватыя плямы.

«Няўжо ўрэшце зіма?» — радасна падумала Марта.

Тут яна заўважыла шматок чорнай тканіны, які зачапіўся за галінку куста пад акном і цяпер матляўся ва ўсе бакі, быццам спрабуючы вырвацца на волю. Але, зачараваная танцам сняжынак, Марта адразу пра яго забылася і толькі варочала галавой, каб не прапусціць ніводнага імгнення такога доўгачаканага снегападу.



# Галубы на падаконні

Наступныя некалькі дзён снег падаў буйнымі камякамі, ні на хвіліну не спыняючыся і толькі час ад часу прыцішваючыся. Марта захоплена назірала, як мяняецца двор. На падаконні ўжо ляжала белая пульхная посцілка. Замест лужын на зямлі з’явілася спачатку цукровая пасыпка, потым — тоўсты, як на смачным піражным, слой суфле, а яшчэ потым — цэлыя гурбы марожанага. Або каштоўнага матэрыялу для лепкі снегавікоў і снежак. Па дарозе са школы дзеці ладзілі баталіі — вядома, зброя ў іх была толькі халодная. Пазіраючы на двор з другога паверха, Марта ўвесь час марыла, каб снежка ўрэшце трапіла ў чыё-небудзь — пажадана не яе — акно. Але снежкі паслухмяна білі толькі па дазволеных мішэнях: дрэвах, слупках агароджы ці іншых стралках. Снегавікоў у двары стаяла ўжо некалькі, і дзяўчынцы здавалася, што любы з іх можа прэтэндаваць на першае месца

ў конкурсе пачварак. Вунь адзін зусім перакасіўся. Цікава, як ён увогуле не зваліўся набок? А ў таго, што трошкі далей, у галаву паўтыканыя галінкі, і ён падобны на шалёнага прафесара, якога толькі што ўдарыла токам. Клёны, ясені і дубы захуталіся ўжо не проста ў снежныя шалікі, а ў таўшчэзныя пухнатыя пледы.

Цяпер двор выглядаў як мае быць. А снег падаў і падаў, быццам і праўда збіраўся засыпаць усё на свеце. У сераду стала відавочна, што яго робіцца зашмат. Бо дагэтуль трактары паспявалі своечасова чысціць дарогі для машын, а дворнікі — дарогі для людзей. Цяпер жа і першыя, і другія ўжо не спраўляліся. Ранкам усё больш аўтамабіляў заставалася пад вокнамі на цэлы дзень, а іх гаспадары і гаспадыні спяшаліся да тралейбуснага прыпынку, вязнучы ў снезе. У навінах, якія слухала мама, дыктары занепакоена расказвалі, што нечуваныя снегапады ставяць вучоных у тупік, і спадзяваліся, што хутка ўсё зноў вернецца да нормы. Марта, калі слухала гэтыя выпускі, толькі хіхікала. Яна не хацела, каб спадзяванні дыктараў спраўдзіліся.

— Калі так пойдзе і далей, — сказаў адным вечарам тата, — то ў наступную нядзелю мы з табой гуляць не будзем. Бо проста не выйдзем з дома. Снег забарыкадуе выхад з пад'езда.

З кожным днём тату даводзілася ўсё раней уставаць на працу. Транспарт хадзіў не па раскладзе, а калі тралейбус урэшце прыязджаў, то ўбіцца ў яго было амаль немагчыма. Вяртаўся тата таксама пазней, чым звычайна.

— Сёння па дарозе я налічыў ажно чатырнаццаць снегапрыбіральных машын, — сказаў неяк ён. — І гэта за нейкія сорак хвілін!

— А можа, яны проста ехалі на працу? — прапанавала сваю версію Марта. — Адначасова з табой.

— Ды яны працуюць круглыя суткі! І ўсё адно некаторыя дарогі пачысціць не паспяваюць. У наш двор ужо ніводная машына не заедзе.

— І не выедзе, — дадала Марта.

Цяпер кожны яе ранак пачынаўся з таго, што яна вызірала ў двор, каб даведацца, наколькі выраслі сумёты і ці не падбіраецца снег пад вокны другога паверха. І хаця пакуль да гэтага было далёка, у сумёты ператварыліся ўжо не толькі запаркаваныя ля дома машыны, але і старая галубятня з краю двара. Ды і гурбы ўздоўж тратуараў, куды дворнікі скідвалі снег, з кожным днём раслі. «Хутка з іх можна будзе катацца на санках, — думала Марта. — Вядома, калі ты можаш на іх катацца».

Калі, наглядзеўшыся на заснежаны падворак, дзяўчынка выбіралася са свайго пакоя, мама на кухні гатавала ёй сняданак, а пасля ішла працаваць. Яна зачынялася ў сябе і вяла праз інтэрнэт урокі англійскай мовы. Калі пад’ехаць да яе дзвярэй, то можна пачуць прыглушанае бубненне. Час ад часу яно замаўкае — гэта значыць, мама ўважліва ўслухоўваецца ў голас, які гучыць у навушніках. Аднойчы Марта цішком прыадчыніла дзверы і некалькі хвілін сачыла, як мама водзіць рукамі, тлумачачы вучню па той бок экрана штосьці вельмі англійскае. Мама нічога не пачула: надзеўшы навушнікі, яна аказваецца гэтак

жа далёка, як тата, які з ранку да вечара сядзіць у офісе на іншым канцы горада.

Удзень да Марты прыходзіла настаўніца, тлумачыла новыя тэмы і давала заданні для самастойнай працы. Дзяўчынка ўсе заданні рабіла хутка, і таму ёй не трэба было доўга сядзець над сшыткамі і падручнікамі. Яшчэ яна займалася з мамай англійскай, і яны разам глядзелі па-англійску ролікі ў інтэрнэце і мульцікі. А калі тата вяртаўся не надта позна, яны ўсёй сям'ёй гулялі ў настольныя гульні.

Але ў Марты ўсё адно заставалася шмат вольнага часу, і яна бавіла яго ля акна, чытаючы, малюючы ці проста гледзячы ў двор.

Сёння там, як на злосць, нічога цікавага. Ніхто не ладзіць археалагічныя раскопкі, шукаючы пад снегам машыну, ніхто не лепіць чарговага кандыдата на конкурс пачварак, нават прахожых не відаць. Апошнім часам людзі стараюцца як мага радзей высоўваць з дому нос, а калі і высоўваюць, то спяшаюцца па справах і не спыняюцца, каб пагутарыць з суседкай ці палюбавацца на танец сняжынак.

Марта ўжо зусім засумавала, але тут на падаконне селі два галубы. «Даўно я вас не бачыла! — узрадавалася яна. — Хоць якая забава». Госці патапталіся па пульхнай посцілцы, пакінуўшы на ёй смешныя сляды-елачкі, і паразграбалі лапамі снег. Паводзіліся яны так, быццам прыляцелі дадому і цяпер шукалі ўласнаручна (ці, можа, уласналапна) схаваны запас семак. І вельмі абураліся, што не знаходзяць.

Тое, што з-за шкла за імі цікуе дзяўчынка, іх зусім не бянтэжыла. Наадварот, галубы нібы спецыяльна



корпаліся ў снезе як мага бліжэй да яе і ў нейкі момант — Марта не паверыла сваім вушам! — нечакана загаварылі.

— Зноў яна тут, — сказаў адзін з іх, відавочна, хлопчык. Ягоныя шыя і грудка адлівалі ружовым і зялёным, а на шызых крылах выразна праглядаліся чорныя палоскі. — Усё сядзіць і сядзіць.

— Магла б нас чым-небудзь пачаставаць, — адгукнулася другая птушка, мабыць, галубка. Яна таксама была шызая, як голуб-хлопчык, і толькі пераліў на яе шыі здаваўся не такім яркім.

— Во-во, — пагадзіўся голуб. — Ёй жа, мабыць, не холадна.

— Што яна там увесь час робіць?

— І не надакучвае ж глядзець!

— Заняцца ёй няма чым ці як?

Яшчэ трошкі патаптаўшыся па падаконні, голуб узяўся чысціць пёркі, а галубка разграбала снег далей, не губляючы надзеі знайсці нешта ядомае.

— Ну і снегу сёлета! — урэшце прабуркавала яна.

— Хутка галубятню зусім засыпле. Давядзецца капаць тунэлі, каб трапіць туды, — пагадзіўся голуб.

— А галубы не павінны нічога капаць. Раней гэтага гідкага снегу столькі не выпадала!

Марта ўявіла, як галубы бяруць маленькія цацачныя шуфлі, скідваюць снег з даху галубятні і робяць тунэлі, час ад часу хукаючы на лапкі, каб сагрэцца. Ёй зрабілася смешна. Яна хіхікнула, і галубы здзіўлена павярнуліся ў яе бок. Трошкі нахіліўшы галовы, яны зірнулі на Марту, а потым пераглянуліся.

— Што за няветлівая дзяўчынка! — сказала галубка. — Хіба можна смяяцца з таго, чаго не разумееш?

— Самі вы няветлівыя! — абурана ўсклікнула Марта. — Прыляцелі на маё падаконне і яшчэ абзываюцца.

— З якога гэта часу падаконне яе? — спытаў у сяброўкі, косячыся на дзяўчынку, голуб. — Яна ж сядзіць з іншага боку.

Тут Марта раззлавалася і замахала рукамі:

— Кыш-ш! Кыш-ш!

Галубы ўспудзіліся і паляцелі прэч. На падаконні засталіся толькі ланцужкі слядоў-елачак, а там, дзе птушкі доўга капаліся ў снезе, белая посцілка выглядала зусім памятай. На ёй нават з’явіліся дзіркі, пад якімі праступіла шэрая бляха. Снежныя камякі тут жа пачалі старанна іх цыраваць.

Марта адразу пашкадавала, што прагнала галубоў. Не кожны дзень да цябе прылятаюць птушкі, якія ўмеюць размаўляць. Хай сабе і нахабы, якія лічаць тваё падаконне сваім. Дзяўчынка зноў і зноў абводзіла вачыма двор і падоўгу спыняла позірк на галубятні ў надзеі пабачыць там балбатуноў. У нейкі момант Марце падалося, што снег на даху будыніны трошкі ўздыбіўся і заварушыўся. Але гэта доўжылася ўсяго імгненне, пасля чаго галубятня зноў застыла ў непарушным спакоі. Колькі дзяўчынка ў яе ні ўглядалася, нічога цікавага там больш не дзеялася. У двары было пуста, і толькі буйныя камякі снегу насіліся ў паветры, ажыўляючы застылы зімовы пейзаж.